А 6 ав, 031 260 860

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Работніца і калгасніца Беларусі № 24

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна

ЗА МОЦНУЮ, ДРУЖНУЮ СЯМ'Ю

Вялікі правадыр пролетарыята Фрыдрых Энгельс у сваёй кнізе «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы» пісаў «... Вырасце новае пакаленне: пакаленне мужчын, якім ніколі ў жыцці не прыдзецца купляць жанчыну за грошы ці другія сродкі соцыяльнай улады, і пакаленне жанчын, якім ніколі не прыдзецца аддавацца мужчыне з-за якіх-небудзь другіх пабуджэнняў, акрамя сапраўднай любві».

Гэтыя словы аказаліся сапраўды прароцкімі. Совецкі лад парадзіў такое пакаленне людзей.

Аб якой устойлівасці сям'і можа гаварыць буржуазія, калі шлюб для яе з'яўляецца сродкам для нажывы, калі газеты капіталістычных краін поўны аб'явамі нявест, шукаючых жаніхоў, і жаніхоў, шукаючых нявест з багатым прыданым? Аб якой любві можа быць гутарка ў гэтых людзішак, якія растрачваюць свае пачуцці на любоўніцах і прастытутках?

Няроўнапраўнасць жанчыны з асаблівай нагляднасцю відна па буржуазных законах аб шлюбе, па якіх муж з'яўляецца поўным гаспадаром у сям'і і жонка абавязана яму ва ўсім падпарадкавацца. Колькі сямейных драм разыгрываецца на гэтай глебе ў капіталістычных краінах!

Вялікая Кастрычніцкая Соцыялістычная рэволюцыя назаўсёды знішчыла прычыны, якія параджаюць няроўнасць у шлюбе. Яна прынесла роўнапраўе жанчыне ў прававым і эканамічным становішчы. Яна стварыла ўсе ўмовы для моцнай спаянай сям'і. Совецкая сям'я аснована на сапраўднай любві, дружбе і вернасці. Яна аснована на самастойнасці мужа і жонкі, на эканамічнай незалежнасці друг ад друга. У велізарнай большасці жонкі не з'яўляюцца ўтрыманкамі мужоў. Яны самі працуюць на вытворчасці, у калгасах, установах. Яны не замыкаюцца ў рамках сваёй сям'і, а актыўна ўдзельнічаюць у будаўніцтве новага жыцця. Пакаленне, вырасшае ў совецкі час, не ведае слова «прыданае», не ведае шлюбу па эканамічнай выгоднасці.

Аб моцнасці совецкай сям'і сведчыць хоць бы і той факт, што разводаў з года ў год у нашай краіне становіцца ўсё менш і менш. Так за тры годы з 1936 па 1939 год—колькасць разводаў паменшылася на 35 процантаў.

У велізарнай большасці сямейнае жыццё ў нас з'яўляецца шчаслівым. Муж'я і жонкі шчыра любяць і паважаюць адзін аднаго. Аднак «сям'я не без выradка»,—гаворыць старая руская пагаворка. На жаль, да гэтага часу ў нас яшчэ не вывеліся людзі, якія ганьбяць у пытаннях быта званне совецкага грамадзяніна.

У № 18 нашага журнала было апублікавана пісьмо комсамолкі Н., дзе яна расказвала аб няўдала склаўшымся ў яе сямейным жыцці. Муж—совецкі спецыяліст, комсамолец пачаў п'янстваваць, дрэнна адносіцца да яе і дзіцяці. У атрыманых многіх водгуках на гэта пісьмо нашы чытачы з абурэннем аднесліся да мужа Н. Яны зусім правільна лічаць, што званне комсамольца і дрэннага мужа і бацькі—гэта зусім несумяшчальныя рэчы.

— Якая каму справа да майго асабістага жыцця?—абураецца такі «комсамолец». Не, ні партыя, ні комсамол, ні грамадскасць не лічаць паводзіны совецкага грамадзяніна ў быту, яго адносіны да сям'і сугуба асабістай справай. Ядома ніхто не збіраецца ўмешвацца ў дробязныя сваркі асобных супругаў і сачыць за імі з-падцішка. Толькі ворагі народа ў комсамоле, стараючыся насаджаць бытавое разлажэнне сярод моладзі, лічылі быт і паводзіны комсамольцаў у сям'і толькі асабістай іх справай.

Владзімір Ільіч Ленін у гутарцы з Кларай Цэткін сказаў: «... У любві ўдзельнічаюць двое, і ўзнікае трэцяе, новае жыццё. Тут крыецца грамадскі інтарэс, узнікае доўг у адносінах да калектыва». З гэтых слоў відаць, як сур'ёзна неабходна адносіцца да пытанняў сямейнага жыцця.

У нас яшчэ не вывеліся і такія людзі, якія з выключнай лёгкасцю, проста злачынна адносяцца да пытанняў сямейнага жыцця. Варта пазнаёміцца з заявамі аб разводах, хаця-б у Мінскім ЗАГС'е, каб у гэтым упэўніцца.

Грамадзянін І. у сваёй заяве ад 13 снежня піша: «Прашу даць дазвол на развод з грамадзянкай Марыяй Осіпаўнай (прозвішча не ведаю). Зышліся мы з ёй 25 кастрычніка гэтага года». Гэта гучыць як анекдот. Але факт, што грамадзянін І. зышоўся з жанчынай, якую зусім не ведае.

21 кастрычніка 1940 года грамадзянка П. зарэгістрыравалася з грамадзянінам Н. 25 таго-ж месяца (праз 4 дні!) яна піша заяву аб разводзе. «Прычына развода ў тым,—піша яна,—што я была зарэгістрыравана пад напорам бацькоў, ад якіх залежу матэрыяльна». Гэта піша чалавек, які лічыць сябе перадавым,—студэнтка аднаго з мінскіх інстытутаў.

Работнік ЗАГС'а тав. Палкіна расказвае як нядаўна ёй з цяжкасцю ўдалося ўгаварыць адну жанчыну забраць сваю заяву аб разводзе з мужам. «Прычына» для развода была тая, што ў мужа дрэнная кватэра. Гэта жанчына мае дзіця ад чалавека, з якім хацела разыйсціся. Якая гэта нізасць пазбаўляць дзіця бацькі з-за дрэннай кватэры!

Прыведзеныя факты вядома адзіночныя ў нашай сапраўднасці, але і яны з'яўляюцца ганебнымі і заслугоўваюць паўнейшага асуджэння грамадскасці.

Совецкія законы накіраваны на ўмацаванне сям'і. У нас няма «незаконнароджаных» дзяцей. У нас няма «незаконных» жонак. У выпадку, калі бацька пакідае дзяцей, ён абавязан клапаціцца аб іх выхаванні. На жаль многія бацькі ў такіх выпадках абмяжоўваюцца ўплатай аліментаў, пазбаўляючы дзяцей бацькоўскай ласкі, бацькоўскіх клопатаў. Ёсць і такія нягоднікі, якія ўсяляк укрываюцца і ад уплаты аліментаў.

Сапраўдная совецкая сям'я будуецца на аснове любві і адданасці мужа і жонкі, бацькоў і дзяцей. У нас ёсць тысячы сем'яў, вырасціўшых радзіме выдатных герояў. Ці-ж не гонарам для нашай рэспублікі з'яўляецца сям'я калгаснікаў Аршанскага раёна Навіцкіх, выхаваўшая трох сыноў-танкістаў, з іх аднаго двойчы ордэнаносца і дэпутата Вярхоўнага Совета СССР? Ці-ж не

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. № 24. СНЕЖАНЬ 1940 г.

НА ВОКЛАДЦЫ: У парку культуры і адпачынку Горацкага сельскагаспадарчага інстытута (Магілеўская абласць)
Фото-эцюд А. Вульфовіч (Фотахроніка БЕЛТА)

гонарам для нас з'яўляецца сям'я калгасніцы арцелі імені Леніна, Мінскага раёна, якая вырасціла сына—Героя Совецкага Саюза тав. Анцілеўскага і многія такія-ж сем'і.

Правадыры пролетарыята, кіраўнікі нашай партыі з'яўляюцца лепшым прыкладам выключна добрых адносін да сям'і. Незамянімым, горача любімым другам была для Карла Маркса яго жонка Жэнні Маркс. Яна дзяліла з ім усе цяжкасці і радасці ў жыцці, была верным памочнікам у велізарнай праробленай ім рабоце. А якім любячым бацькам быў Маркс! Дзеці ў яго жыцці былі велізарнай радасцю.

Выключна цёплым і шчыра дружным было многагадовае сумеснае жыццё Владзіміра Ільіча Леніна з Надзеждай Канстанцінаўнай Крупскай. Якімі чуллівымі былі клопаты Ільіча аб здароўі Надзежды Канстанцінаўны. «У мяне няўзгоды,—пісаў Ленін Горкаму з эміграцыі ў пачатку мая 1913 года,—жонка захварэла базедавай хваробай. Нервы! У мяне таксама нервы крыху шаляць». «Усё збіраўся пісаць вам—піша Владзімір Ільіч у другі раз Горкаму,—ды адкладваў з-за аперацыі жонкі. Трэцяга дня, нарэшце, аперацыя была, і справа ўжо пайшла на папраўку».

Ольга Чкалава, жонка вялікага лётчыка нашага часу, успамінае з якім хваляваннем чакаў з'яўлення на свет свайго дзіцяці Валерый Паўлавіч Чкалаў. У гадавіну нараджэння сына ён ёй пісаў: «... 1-га быў мысленна з табой і Ігарам, думаў толькі аб табе і твой вобраз бачыў вельмі ясна. Адчуваў твае болі і пакуты, успамінаў твой твар у той дзень, калі быў у цябе ў палаце пасля родаў. Твой твар гаварыў аб перанесеных табой цяжкіх пакутах і болю. У той-жа час на ім было напісана неаб'яснімае, добрае пачуцце, пачуцце мацярынства, пачуцце таго, што ты дала свету яшчэ новую жывую істоту. А як я быў у гэты дзень рад, задаволен, мне хацелася крычаць, спяваць, насіць цябе на руках. Ты дала мне тое, чым я жыву цяпер і маё жыццё стала якімсьці прыгожым і дарагім. Ты і сын—вось маё жыццё, маё паветра і свет». Такія адносіны да сям'і з'яўляюцца тыповымі для нашага асяроддзя.

У дружнай совецкай сям'і не павінна быць месца для пашлякоў і нягоднікаў.

ТРЫЦЦАЦЬ ГОД ПЕДАГАГІЧНАЙ РАБОТЫ

Калі глядзіш на жывую, энергічную, ніколі не сумуючую Роню Ільінічну Якубсон, не верыцца, што за плячыма гэтай жанчыны звыш трыццаці год няспыннай педагагічнай работы.

17-гадовай дзяўчынкай прышла Роня Ільінічна да дзяцей. Каб стаць педагогам-майстрам, сапраўдным «інжынерам дзіцячых душ», трэба было многа вучыцца. І Роня Ільінічна з упартасцю і настойлівасцю вучылася, перамагаючы ўсе цяжкасці. Каб атрымаць магчымасць вучыцца на вышэйшых педагагічных курсах яна паступіла на акушэрскія курсы, бо акушэрскае званне давала ёй, яўрэйцы, права на жыхарства ў Пецербургу. Многа было цяжкасцей. Але яна не згубіла веры ў свае сілы, любві к дзецям, жадання працаваць.

У сучасны момант Роня Ільінічна Якубсон выкладае рускую мову ў сёмай сярэдняй школе горада Мінска. Гэта сапраўдны майстар педагагічнай справы. Яна не толькі грунтоўна вывучае матэрыял, які прыпадносіць дзецям, але прадумвае кожную дэталь у пабудове ўрока, кожны метад, прыём работы.

Урокі рускай мовы ў Роні Ільінічны—гэта цікавая і разнастайная работа ўсіх вучняў у класе. Выключную ўвагу тав. Якубсон удзяляе навыкам самастойнай работы вучняў, іх вуснай мовы. Славарная работа, добра пастаўлены граматычны разбор, сістэматычнае паўтарэнне, уважлівая дапамога адстаючым вучням—усё гэта шляхі к глыбокаму засваенню вучнямі рускай мовы. І не дзіўна, што на працягу многіх год паспяховасць па рускай мове ў класах, дзе працуе тав. Якубсон, высокая. Паспяховасць па рускай мове ў гэтых класах за першую чвэрць бягучага года перавысіла 90 процантаў.

Выдатны педагог Роня Ільінічна ўпэўнена дабіваецца ажыццяўлення пастаўленай перад сабой мэты—даць 100 процантаў паспяховасці па свайму прадмету.

С. Г. Цлаф, загадчык вучэбнай часцю.

Мінск.

77 юнатаў Цэнтральнай станцыі юных натуралістаў БССР былі ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1939 і 1940 гг. Змагаючыся за яшчэ лепшы ўдзел у выстаўцы 1941 г. юнаты выклікалі на спаборніцтва рэбят сонечнай Грузіі.

На здымку: Момант падпісання соцдагавора з юнымі натуралістамі Грузінскай ССР. Падпісвае юнат—выдатнік вучобы 3-га класа 19 Мінскай школы Толя Манькоў.

Фото К. Якубовіча і С. Вальфсона (Фотахроніка БЕ ЛТА).

СТАРШЫНЯ сельсовета

Праскоўя Сямёнаўна Сідарук — старшыня Гарадзецкага сельсовета разглядала кіпу пратаколаў агульных сходаў сялян.

— Бачыце,—звярнулася Праскоўя Сямёнаўна да нас, паказваючы на адзін з пратаколаў. У канцы гэтага пратакола, там дзе стаяць подпісы членаў прэзідыума схода, замест прозвішча быў пастаўлен крыжык,—гэта сляды польскай «цывілізацыі». Польскія каты трымалі працоўны народ у цемры і невуцтве. Гэта было ім выгадна.

Жанчына гаварыла, і ў яе вачах іскрылася злосць. У мужным голасе гучэла праклянне польскім прыгнятальнікам, якія на працягу дваццаці год трымалі працоўны народ былой Заходняй Беларусі пад цяжкім уціскам капіталістычнай эксплаатацыі.

Нашу гутарку перарваў нясмелы стук у дзверы кабінета.

— Заходзьце,—адказала старшыня і кінула позірк на дзверы.

У кабінет праз дзверы прасунулася бабулька. Абапіраючыся на палку, яна спынілася ля дзвярэй.

— З чым добрым наведала нас, бабулька?—загаварыла Праскоўя Сямёнаўна.

— Я прышла наконт дроў...

Старшыня сельсовета ўважліва выслухала наведвальніцу, зрабіла заметку ў сябе ў блок-ноце і запэўніла бабульку, што тая атрымае дровы.

У сельсавет, да Праскоўі Сямёнаўны штодзённа прыходзяць дзесяткі наведвальнікаў. Яны зварочваюцца да старшыні па разнастайных справах. Адны ідуць за парадай, другія за дапамогай. Праскоўя Сямёнаўна прымае ўсіх ветліва і гасцінна.

Любоў і павагу да працоўнага народа гэта жанчына выхавала ў сабе з малых год. Яна з юнацтва прысвяціла сваё жыццё барацьбе за шчаслівую долю працоўных.

Праскоўя Сямёнаўна Сідарук нарадзілася ў глухой беднай палескай вёсцы Ілаўск у сям'і селяніна-бедняка. Гаспадарка яе бацькі была адна з тых, якія пад уплывам кулацкай і памешчыцкай кабалы ўсё больш разбураліся.

Жывучы ў глухой вёсцы, дзяўчына была сведкай беднага жабрацкага жыцця палескіх сялян. На яе вачах сяляне стагналі пад гумавымі палкамі паліцэйскіх, пралівалі свой пот на шырокіх памешчыцкіх нівах і кулацкіх загонах. Дзяўчына бачыла як над бяспраўным народам учыняліся свавольствы і жудасныя здзекі.

Зусім маладой Праскоўя Сямёнаўна Сідарук уключылася ў рэволюцыйны рух. Два годы падпольнай работы загартавалі дзяўчыну, выхавалі мужны характар. Яе не спалохаў суд, які ўчыніла польская дэфензіва над групай рэволюцыйных сялян у 1932 годзе. Праскоўя Сямёнаўна трымала сябе на судзе стойка і не выдала таварышоў па падпольнай рабоце, што асталіся на волі. Яе асудзілі на 2 годы пазбаўлення волі.

У 1934 годзе Сідарук вышла з турмы. Катаванні і здзекі не зламалі яе волі да барацьбы. Яна з галавой уходзіць у падпольную работу, аддаючы рэволюцыйнай барацьбе ўсе свае сілы. Праз сем месяцаў пасля выхаду з турмы—зноў арышт.

Суд адбываўся ў Кобрыне. Сідарук, як небяспечная для польскіх улад і маючая вялікі аўтарытэт у працоўных сялян (як кваліфікаваў гэта суд), была прыгаворана да шасці год турэмнага зняволення.

Асуджаную на гэты раз сустрэлі вільготныя і суровыя сцены цёмных камер цэнтральнай турмы для палітзняволеных жанчын у Фардоне.

З прыходам Чырвонай Арміі Праскоўя Сямёнаўна Сідарук уключаецца ў актыўную работу па ўстанаўленню рэволюцыйнага парадка на вызваленай зямлі. Яна працуе ў сялянскім камітэце, потым пры Часовым упраўленні ў горадзе Кобрыне, прымае ўдзел ў стварэнні народнай міліцыі. Працоўныя выбіраюць сваю верную дачку дэпутатам Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Праскоўя Сямёнаўна Сідарук з чэсцю выканала волю вызваленага народа—яна ад шчырага сэрца прагаласавала за совецкую ўладу.

Кіпучая творчая работа на вызваленай зямлі захоплівае гэту энергічную жанчыну. Сідарук працуе загадчыцай Кобрынскага дзіцячага сада № 2, з'яўляецца членам акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

У жніўні, пасля сканчэння абласных курсаў нізавых совецкіх работнікаў, Праскоўю Сямёнаўну прызначаюць старшынёй Гарадзецкага сельсовета, Антопальскага раёна. Сельсовет быў адным з адстаючых у раёне.

Новы старшыня Праскоўя Сямёнаўна энергічна ўзялася за работу. Яна распачала сваю дзейнасць са стварэння і згуртавання вакол сельсовета актыва. Зараз у сельсавеце налічваецца каля 60 актывістаў, якія з'яўляюцца першымі і надзейнымі дапаможнікамі ў рабоце сельсовета.

Дзейнасць сельсовета тав. Сідарук падпарадкоўвае інтарэсам дзяржавы і народа. Аднойчы летам да старшыні прышоў актывіст з вёскі Мефедавічы Васіль Якімчук.

— Нашы сяляне жадаюць мець у сваёй вёсцы школу. Прышоў да вас за парадай.

Старшыня сельсовета падха-

На фабрычным выбарчым участку № 8 г. Беластока. Галасуюць за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных работніцы 20-й тэкстыльнай фабрыкі Э. І. Сабалеўская—72 год, яе дачка С. Ф. Шылак—50 год і 20-гадовая ўнучка Я. Я. Шылак.
Фото А. Сапіра (Фотахроніка БЕЛТА).

Сяляне вёскі Замасточча, Смаргоньскага раёна, Вілейскай вобласці выходзяць пасля галасавання з памяшкання выбарчага ўчастка № 33.
Фота І. Шышко (Фотахроніка БЕЛТА).

піла ініцыятыву сялян. Яна мабілізавала іх на будаўніцтва школы. І ў вёсцы да пачатку навучальнага года з'явілася новае прыгожае памяшканне сельскай пачатковай школы.

Праз тэрыторыю сельсовета праходзіць траса вялікага збудавання Днепра-Бугскага канала. Сяляне прынялі самы актыўны ўдзел у будаўніцтве канала. Многія з іх на канале працуюць і зараз.

Сельсовет праводзіць вялікую работу па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. На тэрыторыі сельсовета створаны тры вячэрніх школы дарослых.

Гарадзецкі сельсовет з адстаючых ператварыўся ў перадавыя. Сяляне паспяхова і ў тэрмін выконваюць свае абавязацельствы перад дзяржавай. У гэтым вялікая заслуга старшыні Праскоўі Сямёнаўны Сідарук.

— Нам трэба мець добрую амбулаторыю, аптэку, кіно,—гаворыць Праскоўя Сямёнаўна.

Сяляне паважаюць гэту звычайную, але шчырую жанчыну. Яны ёй аказалі вялікае давер'е, абраўшы дэпутатам сельскага, раённага і абласнога Советаў дэпутатаў працоўных.

Ал. Махнач.

Антопальскі раён,
Брэсцкай вобласці.

Буду працаваць на карысць народа

Не так многа прайшло часу, калі Чырвоная Армія вызваліла працоўных Заходняй Беларусі ад іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Совецкая ўлада назаўсёды знішчыла беспрацоўе, нішчату на вызваленай зямлі.

Народы заходніх абласцей Беларусі пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі будуюць сваё новае, шчаслівае жыццё. Соцыялістычнае будаўніцтва ў заходніх абласцях БССР з кожным днём набывае новы размах. Для прыкладу можна прывесці Вілейку. Раней, у часе існавання Польшчы, у Вілейцы панавала цемра і бескультур'е. Цяпер горад Вілейка з'яўляецца абласным цэнтрам, дзе жыццё б'е крыніцай.

За час совецкай улады непазнавальна вырас горад. Пабудаваны сярэдняя школа, больніца, радыёзавод, трохпавярховы жылы дом, заканчваецца будаўніцтва механічнай хлебапякарні. Працуюць паліклініка, дзіцячая кансультацыя, сад. Будуюцца кінотэатр, лазня, санітарная станцыя і інш.

Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі мы, жанчыны заходніх абласцей Беларусі, атрымалі роўныя правы з мужчынамі. Мы карыстаемся ўсімі правамі ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і палітычнага жыцця.

У панскай Польшчы працоўная жанчына была зусім закінутай. На яе глядзелі, як на нейкую ніжэйшую істоту. Праца яе дрэнна аплачвалася. Да такіх жанчын раней адносілася і я. З малых год мне прышлося працаваць. Выконвала розную цяжкую работу: насіла пясок, грузіла каменне, цэглу ў вагоны. Працавала па 11-12 гадзін у дзень і амаль задарма.

Толькі пры совецкай уладзе жанчыны атрымалі поўнацэннае жыццё. Сотні з іх абраны дэпутатамі ў мясцовыя органы совецкай улады. Я таксама абрана дэпутатам Вілейскага гарадскога Совета. Ніколі нават і марыць я не магла, што буду прымаць удзел у вырашэнні дзяржаўных пытанняў.

Вельмі люблю грамадскую работу і прымаю ў ёй актыўны ўдзел. З'яўляюся членам таварыства Чырвонага Крыжа, старшынёй пярвічнай арганізацыі МОПР'а. У часе выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных працавала членам гарадской выбарчай камісіі. Таксама прымала актыўны ўдзел у выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

На сустрэчы са сваімі выбаршчыкамі я абяцала ім, што давер'е аказанае мне апраўдаю з чэсцю. Усё сваё жыццё буду верна служыць працоўнаму народу.

Марыя Александраўна Альфер, дэпутат Вілейскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

Дэпутат павінен ведаць, што ён слуга народа, яго пасланец у Вярхоўны Совет і ён павінен вясці сябе па лініі, па якой яму дан наказ народам.

СТАЛІН.

У трэці раз на выстаўку

На VIII з'ездзе ВКП(б) у 1919 годзе Владзімір Ільіч Ленін у сваім дакладзе аб рабоце ў вёсцы гаварыў: «Калі-б мы маглі даць заўтра 100 тысяч першакласных трактароў, снабдзіць іх бензінам, снабдзіць іх машыністамі (вы вельмі добра ведаеце, што пакуль гэта фантазія), то сярэдні селянін сказаў-бы «Я за комунію» (г. зн. за комунізм)».

Гэта мара Леніна ператворана ў жыццё пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна. Аснашчонасць нашага соцыялістычнага земляробства сучаснай перадавой тэхнікай дэманструецца на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Сярод многатысячных машын, павольна рухаючыхся на канвеерных транспарцёрах у павільёне «Механізацыя», устаноўлена 16 машын з маркай завода «Гомсельмаш» імені Кагановіча.

Высокую чэсць зацверджання экспанентам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1939—1940 года завод заслужыў у рэзультаце ўнядрэння стаханаўскіх метадаў работы, прымянення новай перадавой тэхнікі і выпуску новых сельскагаспадарчых машын.

Завод «Гомсельмаш» з'яўляецца дзецішчам першай Сталінскай Пяцігодкі. Ад выпуску нескладаных сіласарэзак «Папек» у 1930 годзе ён перайшоў на выпуск самых складаных машын.

За дзесяць год існавання заводам выпушчана каля 300 тысяч машын, прыкладна на 135 мільёнаў рублёў. Усе яны з'яўляюцца вялікім укладам у механізацыю сельскагаспадарчых работ. Машыны маркі «Гомсельмаш» працуюць не толькі на палях нашай радзімы, але і паза межамі яе, адкуль завод атрымлівае добрыя водзывы. У 1940 годзе машыны завода экспаніраваліся на выстаўцы ў горадзе Плоўдзіве (Балгарыя).

За дасягнутыя поспехі ў стварэнні новых машын завод узнагароджан Галоўным выставачным камітэтам дыпломам другой ступені, 5 тысячамі рублямі і матацыклам. Залатымі медалямі ўзнагароджаны дырэктар завода тав. Генкін і начальнік тэхнічнага аддзела тав. Караўскі. У лістападзе гэтага года



Таццяна Прохараўна Шулякова, штампоўшчыца кузнечнага цэха, выконвае новыя нормы на 160—170 процантаў. (Гомель, „Гомсельмаш").

Соўнаркам БССР вылучыў завод і групу лепшых людзей завода ў трэці раз кандыдатамі на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

У адказ на гэту высокую чэсць калектыў прадпрыемства датэрмінова закончыў гадавую праграму па таварнай прадукцыі. На 12 снежня план выканан на 100,1 процанта і да канца года выпусціць на 1,5 мільёна рублёў прадукцыі звыш плана.

На выстаўцы ўдзельнічаюць таксама і лепшыя людзі завода, будаўнікі сельскагаспадарчых машын, канструктары, стаханаўцы, якія выдзеліліся ў барацьбе за асваенне новай тэхнікі і стаханаўскіх метадаў работы. Сярод іх адну трэць складаюць жанчыны, лепшыя стаханаўкі завода. Партрэты іх выстаўлены на стэндзе ў павільёне «Механізацыя».

Да ліку жанчын, якія ўдастоіліся вялікага гонару ўдзельнічаць ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, адносяцца: штампоўшчыца Таццяна Прохараўна Шулякова, токар-многастаночніца Александра Нікітаўна Петракова. Таварыш Шулякова прайшла свой шлях ад хатняй работніцы да кваліфікаванай штампоўшчыцы.

На заводзе ёсць нямала жанчын-стаханавак, выдатніц соцыялістычнай працы.

Яркім прыкладам шчаслівага жыцця і творчасці могуць служыць жанчыны дрэваапрацоўчага цэха. Вось тав. Бельцова, якая з радавой работніцы стала майстрам брыгады сетачніц, дэпутатам гарадскога Совета. Тав. Маціс з вучаніцы выросла да старшай учотчыцы цэха. Яна фізкультурніца. Заняла другое месца па лёгкай атлетыцы сярод фізкультурнікаў заводаў сельгасмашынабудаўніцтва. Кандыдат партыі тав. Бакуліна, былая хатняя гаспадыня, зараз лепшая стаханаўка завода.

Многія жанчыны ў нас выраслі ў дзяржаўных дзеячоў. Токар механа-зборачнага цэха тав. Александрава з'яўляецца членам выканаўчага камітэта гарадскога Совета дэпутатаў працоўных. Былая работніца дрэваапрацоўчага цэха тав. Кулікава працуе зараз намеснікам старшыні Гомельскага абласнога суда. Інжынер Геня Ліўшыц абрана сакратаром раённага камітэта партыі. Работніца механазборачнага цэха тав. Кац працуе дырэктарам Гомельскай фабрыкі імені Клары Цэткін. Інжынер дрэваапрацоўчага цэха тав. Стасенка з'яўляецца дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР. Зараз працуе інструктарам ЦК КП(б)Б.

Жанчыны завода «Гомсельмаш» прымаюць самы актыўны ўдзел у рэалізацыі рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б) аб пад'ёме соцыялістычнага земляробства.

Г. Л. Плоткін,
кіраўнік групы эканамічнага планіравання планава-вытворчага аддзела.

Людзі і справы

На дварэ гуляла снежная завіруха. Выў вецер, рыпелі за вокнамі старыя ліпы. У хату даносіліся няясныя гукі, быццам хто вялікі злосна і заўзята рагатаў, прысвістваў, плакаў і біў аб зямлю абледзянелымі магутнымі нагамі.

Вера Жук не спала. Яна толькі-што прышла з кароўніка і, распрануўшыся, лягла на ложак. Слухала, як скігоча вецер у коміне, як плача ён там, і ў галаве чарадою плылі думкі.

Сёння ноччу павінна ацяліцца карова «Адоля»,—гордасць малочна-таварнай фермы калгаса. Карова гэтая дае па 15 літраў малака ў суткі і таму цялё, якое яна прывядзе, трэба асабліва старанна пільнаваць. У кароўніку Вера Жук пакінула вартаўніка. Калі ішла дадому, дык нейк асабліва трывожылася. І вось зараз не магла закрыць вачэй. Ці не засне вартаўнік? Чаго добрага яшчэ прагледзіць, а ці мала што з цялём здарыцца можа...

Раптам ціхі і настойлівы стук у акно.

— Вера, у кароўніку...

І абарваўся голас, чутно толькі, як затупацелі крокі ад акна на вуліцу.

Што здарылася? Няўжо «Адоля» абартыравала? Можа, яна прывяла нежывое цялё. А, можа, вартаўнік не дагледзіў, як трэба і цялё загінула...

Яна бегла да калгаснага двара і з кожнай мінутай усё шпарчэй працавалі яе думкі.

— Што-ж там такое? Няшчасце?.. Якое няшчасце?..—Стукала шпарка сэрца ў грудзях, а яна ўсё бегла і бегла, таропка хутаючыся ў вязаны шарф. Але вось і калгасны двор. Яна заглянула ў малочную. Там нікога не было. Толькі сепаратар халодна блішчэў сталёвымі ручкамі. У двары—таксама нікога. На снезе бачыла сляды, што вялі ў кароўнік. Тады жанчына пабегла да кароўніка. Яе сустрэла даяркa Чарняўская Ліпа.

— Што здарылася?

— А нічога. «Адоля» ацялілася. Цёлка...

І разам быццам стопудовы цяжар скінула з плеч... У кароўніку, на свежым падсціле, ляжала «Адоля». Ля яе было цялё. Яно мела жоўтую поўсць, было прыгожае, але слабае. Загадчыца ўзяла яго на рукі і радасна сказала:

— Якое-ж яно? На абрыкос падобна...

А Ліпа сказала проста:

— Ну, вось. А мы тут столькі думалі, якую клічку яму даць. Лепшую, здаецца, і не прыдумаеш. «Абрыкос»—гэта прыгожа...

Малочна-таварная ферма калгаса «Беларусь»—лепшая ў Рэчыцкім раёне. Спачатку тут працавалі без аніякага распарадку, па-старому. Вера Жук увяла гэты парадак.

Кожны раз а палове пятай раніцы ў хлеве робіцца падсцілка. Потым даяркі пачынаюць даіць кароў. Усіх даярак чатыры.—Чарняўская Ліпа, Пешкун Анна, Глушак Поля і Гапоненка Куліна. Яны добрасумленна і чэсна выконваюць свае абавязкі.

З шасці гадзін раніцы пачынаюць паіць цялят, карміць кароў. У 12 гадзін робіцца падкормка, у 4 гадзіны вечара кароў пояць, у 6—дояць, а пасля кладуць корм на ноч.

Даярка, як правіла, поіць цялё ад кожнай замацаванай за ёй каровы 15 дзён. Потым цялё перадаецца цялятніцам. У гэтым годзе даяркі выпаілі 38 цялят—увесь прыплод. Вера Жук увяла рацыён корму.

Ферма калгаса налічвае зараз 113 галоў рагатай жывёлы. Кожная дойная карова ў гэтым годзе дала ў сярэднім 1500—1600 літраў малака. Калгас здаў дзяржаве 22500 літраў малака, звыш плана прадалі дзяржаве 500 літраў.

Ферма за год прынесла калгасу 45 тысяч рублёў прыбытку. Загадчыцу фермы, якая працуе на ёй ужо 9 гадоў, паважаюць і шануюць у калгасе. Увесь свой вопыт, усё ўменне яна, не шкадуючы сваіх сіл, укладае, каб зрабіць ферму яшчэ лепшай.

Справа калгаса—яе ўласная справа. Гонар калгаса—яе ўласны гонар.

М. Лупсякоў.

Рэчыцкі раён.

22 снежня ў Мінску адбыўся першы ваенізіраваны пераход камсамольцаў і моладзі на 15 кілометраў для мужчын і 7 кілометраў для жанчын.
На здымку: Удзельніцы перахода Мінскага сельскага раёна ў паходзе.
Фота І. Рабіновіча.



Пано—вышыўка, „Л я в о н і х а" выканалі вышывальшчыцы сістэмы Белмастакпромсаюза: Герасіменка М. П., Грыгор'ева Д. А., Данілец А. Г. Карэняка Е Ф., Лукошкіна П. Ф., Мітраховіч Ф. І., Пілат Н. Ф., Пратасевіч С. М., Рагуцкая Н. П., Саламеннік А. В., Ступіна Г. А., Сурына В. А. Сяліцкая Е. І., Цітавец Н. Пад кіраўніцтвам Мікульчык М. Па эскізу мастакоў: заслужанага дзеяча мастацтва БССР Волкава В. В. і мастака Марыкса.

Вышывальшчыцы

7 месяцаў таму назад арганізавалася наша арцель. У ёй было тады толькі 15 чалавек. Многія аднесліся да арганізацыі яе недаверліва, але вельмі хутка гэта недавер'е рассеялася. З першых-жа дзён нашай работы работніцы ўпэўніліся, што і работа аплачваецца як след і сыравіны хапае.

У арцель да нас прышлі і высокакваліфікаваныя работніцы, якія раней эксплаатаваліся гаспадарамі, і людзі, якія яшчэ толькі пачынаюць працоўную дзейнасць. Кваліфікаваныя работніцы ахвотна перадаюць свой вопыт навічкам. Для часткі работніц мы арганізавалі вячэрнія курсы па павышэнню кваліфікацыі.

Многія вышывальшчыцы выконваюць нормы на 200 процантаў. Так Эстэр Урык, Хая Почынка зарабляюць па 400—500 рублёў у месяц. Добра працуюць і Тамара Трыкала, Валя Лубніцкая, Жукоўская і многія другія.

У нас працуюць людзі розных нацыянальнасцей: беларускі, полькі, яўрэйкі. Усе паміж сабой дружаць і паважаюць адна другую. Арцель зараз налічвае каля 150 чалавек. Мы вышываем плацці, жаночыя блузкі, мужчынскія рубахі, абрусы, ручнікі. Ёсць у нас брыгады і ў вёсках. У брыгадзе вёскі Страдзіч налічваецца 60 вышывальшчыц. Многія з іх з'яўляюцца выдатнымі майстрамі. 56-гадовая Зінаіда Яковук вышывае напамяць разнастайныя ўзоры вельмі хутка і прыгожа. Яна расказвае: «Пры панскай Польшчы з нас смяяліся, калі мы адзявалі вышытыя рубахі, але мы любілі свае беларускія ўзоры і лічылі іх найпрыгажэйшымі». У Страдзічах мы таксама арганізавалі ткацкую брыгаду. Лепшыя майстрыцы будуць ткаць мастацкія вырабы.

Арцель штомесячна выконвае план на 150 і больш процантаў. Я радуюся гледзячы на нашых работніц. Яны ўпэўнены ў заўтрашнім дні. Яны ўжо больш ніколі не пазнаюць беспрацоўя. Рада я і за сябе. Ці думала я, былая беспрацоўная, якая з вялікай цяжкасцю дабывала кавалак хлеба, што вырасту ў кіраўніка прадпрыемства, што буду дэпутатам гарадскога Совета—дзяржаўным дзеячом? Толькі пры совецкай ўладзе магчым такі рост людзей.

Вера Кузоўка, старшыня арцелі „Народная творчасць" Брэст.

НОВЫМІ ВЫТВОРЧЫМІ ПЕРАМОГАМІ СУСТРЭНЕМ XVIII КАНФЕРЭНЦЫЮ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БОЛЬШЭВІКОЎ)!

У вучылішчы

Яны прыехалі з розных канцоў рэспублікі, з розных калгасаў і гарадоў, але з адной і той-жа мэтай—атрымаць кваліфікацыю і ўліцца ў вялікую сям'ю будаўнікоў комуністычнага грамадства.

Каця Шчэбетава да гэтага жыла на станцыі Бобр. Бацька яе грузчык. Яна яшчэ ў дзяцінстве мела вялікую цягу да машын і вось цяпер яе мара ажыццявілася. Яна прынята ў Мінскае чыгуначнае вучылішча і праз два годы будзе кваліфікаваным токарам.

З гэтай-жа мэтай прыехала ў чыгуначнае вучылішча з Быхаўскага раёна Ліда Каплунова, з Смаленска—Надзя Балбышкіна і Ліда Левашэва, Маруся Раманоўская са станцыі Слаўнае і другія 16 дзяўчат, якія зараз амаль поўнасцю саставілі токарную групу вучылішча.

Усяго некалькі тыдняў, як яны знаходзяцца ў чыгуначным вучылішчы, але і за гэты кароткі час дзяўчаты паспелі не толькі пазнаёміцца, а і падружыцца. Яны ўжо ведаюць правілы ўнутранага распарадка, мэты і задачы вучылішча.



Выдатнікі вучобы—вучні 10 класа „Б" 4-й Мінскай сярэдняй школы імені Кірава комсамольцы Г. Пыліла (злева), С. Ліўшыц і Р. Ліўшыц на практычных занятках у фізічным кабінеце.
Фото Б. Вернера (Фотахроніка БЕЛТА).



У Мінскім чыгуначным вучылішчы № 1. На здымку: Майстар такарнай групы № 12 С. Ф. Карабановіч растлумачвае вучаніцы А. І. Каржаковай, як змяраць дэталі ў працэсе абточкі на такарным станку.
Фото І. Рабіновіча.

Вучні чыгуначнага вучылішча акружаны ўвагай і клопатамі з боку кіраўнікоў вучылішча

— У вучылішчы мы сябе адчуваем як дома,—гаворыць Зіна Андруховіч,—партыя і ўрад, наш родны бацька таварыш Сталін зрабілі ўсё для таго, каб мы маглі вучыцца. Мы будзем вучыцца на «выдатна», а потым таксама выдатна працаваць там, куды нас пашлюць.

Як толькі пачынаецца раніца, дружна і арганізавана вучні займаюць свае месцы ля станкоў, ціскоў, запаўняюць вучэбныя аўдыторыі. У такарным цэху ўстаноўлена 24 такарных, 1 рэвальверны, 2 фрэзерных і 2 строгальных станкі. Тут займаюцца 25 юнакоў і дзяўчат—будучыя кваліфікаваныя токары. Кіруе групай вопытны майстар т. Кунда, які 18 год працаваў у школе ФЗВ, цяпер рэарганізаванай у чыгуначнае вучылішча.

Першыя дні прайшлі ў азнаямленні са станкамі. Зараз дзяўчаты прыступілі да вывучэння такарнай справы.

У сталярным цэху працуюць у асноўным вучні былога фабрычна-заводскага вучылішча чыгуначнікаў. Яны ўжо раней прайшлі трэніроўку і зараз самастойна працуюць за верстакамі.

Таксама арганізавана ідуць заняткі ва ўсіх 13 групах. Вопытныя высокакваліфікаваныя выкладчыкі і выхавацелі рыхтуюць краіне новыя працоўныя рэзервы.

Праз два годы краіна атрымае з Мінскага чыгуначнага вучылішча 75 высокакваліфікаваных памочнікаў паравозных машыністаў, 50 токараў, 25 слесараў па рамонту паравозаў, 25 слесараў-вагоннікаў, многіх кавалёў, столяраў, брыгадзіраў пуці.

Гр. Васільеў.

Мінск

Добра зімою на санках. На здымку: Выхаванцы дзіцячага сада № 83 (г. Мінск)
Фота І. Рабіновіча.

Зм. Бядуля

СНЯЖЫНАЧКІ

Сняжыначкі, пушыначкі,
Як матылькі, ляцелі.
Як красачкі-пралесачкі
Над хаткамі блішчэлі.

Бялеліся, мігцеліся
У розныя калёры
Драбнюткія, пякнюткія
Як зорачкі, як зоры.

Насіліся, кружыліся
Над ціхімі палямі.
Сняжыначкі даліначкі
Пакрылі дываналі.

Я. Колас

МАРОЗ

Ой, які благі мароз,
Шчыпе вушы, шчыпе нос.
Мы адзелі рукавіцы,
А мароз нас не баіцца.
Як пачалі працаваць,
Снег лапаткамі кідаць,
Накладаць яго на воз,—
Перастаў пужаць мароз.
Дзень сягоння цёплы,
Узялі дзеці санкі
І катаюцца з гары
На лясной палянцы.

ВЛАДЗІМІР ІЛЬІЧ НА ЁЛЦЫ

В. Бонч-Бруевіч

I

Увосень 1919 года Надзежда Канстанцінаўна моцна захварэла. Владзімір Ільіч быў вельмі занепакоены яе хваробай. Парашылі, каб Надзежда Канстанцінаўна пасялілася ў Сакольніках, у адной Лясной школе, дзе на другім паверсе быў вольны невялікі пакойчык. Дактары казалі, што свежае паветра ёй дапаможа, а сумна ёй там не магло быць, таму што ў школе было шмат дзетвары. Надзежда Канстанцінаўна вельмі любіла дзяцей.

Так яно і было. Яна пераехала ў Лясную школу. 22 снежня паклікаў мяне Владзімір Ільіч і кажа:

— Хочаце, Владзімір Дзімітрыевіч, прыняць удзел у дзіцячым святе?

— Хачу,—кажу.

— Ну дык вось, даставайце, дзе хочаце, пернікаў, цукерак, хлеба, хлапушак з касцюмамі, масак, цацак і паедзем 24 снежня ўвечары Надзю наведаць, і дзеткам свята наладзім, а на расходы вось вам грошы для складчыны.

Год быў цяжкі, галодны і халодны. Грамадзянская вайна кіпела ўсюды, і ўсё, што мог, урад адсылаў на фронт. У гарадах прадуктаў было мала. Сяк-так, патрошку, купілі мы ўскладчыну ўсё, што маглі, для дзяцей і адаслалі напярэдадні ў школу, каб дзеці разам з настаўніцай падрыхтавалі ёлку.

II

Ёлка заўсёды прыгожая зімою. Марозы закавалі прыроду і снег упрыгожыў лясы. Дрэвы ўсе агаліліся яшчэ ўвосень, заслаўшы зямлю жоўтым лісцем. І толькі адна сасна і ёлка ў нашым кліматэ стаяць упрыгожаныя вечна зялёнымі калючкамі. З даўніх часоў, калі стары год мінаецца і новы надыходзіць, многа якія народы наладжваюць свята зімы, зімовага адпачынку, зімовых забаў, зімовага балявання. Ёлкі, вясёлыя, прыгожыя і зялёныя, заўсёды прывабліваюць да сябе моладзь, якая любіць патанцаваць і пакружыцца вакол ёлак, не толькі ў пакоях, а проста на паветры, у садзе, на дварэ, на ўскрайку лесу. Ёлку ўпрыгожваюць, вакол яе танцуюць у светлыя месячныя вечары, спяваюць песні, частуюцца і весяляцца. Я сам бачыў такія святы, якія захаваліся ў паўночных народаў да цяперашняга часу.

У Фінляндыі дагэтуль яшчэ пашыраны звычай сярод сялян наладжваць ёлку на адкрытым паветры. Калі бывае вельмі холадна, дык тут-жа раскладваюць вялікія кастры, ля якіх грэецца моладзь. Тут-жа гуляюць у снежкі, робяць снежных баб і наогул весяляцца ўдостач.

Калі надыходзяць зімовыя канікулы, вельмі прыемна павесяліцца. Ёлка еднае дзяцей, наладжваць яе прыемна, спяваць каля яе песні таксама нядрэнна, і патанцаваць вельмі забаўна.

III

Вось мы з Владзімірам Ільічом гадзін у 5 вечара паехалі 24 снежня ў Лясную школу. Я прыехаў раней. Праз некаторы час прыехаў Владзімір Ільіч з Марыяй Ільінічнай.

Владзімір Ільіч пайшоў да Надзежды Канстанцінаўны і неўзабаве разам з ёю сышоў уніз да дзяцей, якія радасна сустракалі яго і наперабой задавалі яму пытанні.

— У што мы будзем гуляць?—запытала Владзіміра Ільіча вельмі жвавая дзесяцігадовая дзяўчынка.—Давайце хутчэй! А то сумна! Мы вас прачакаліся! Ну, у што-ж?

— Зараз карагод вакол ёлкі,—жыва адказаў Владзімір Ільіч.—Спяваць будзем, а потым у кошкі-мышкі...

— Згодны, згодны!—хлопаючы ў ладкі, радасна крычала дзяўчынка і ўсе другія хорам за ёю.

— Згодны? Ну дык што-ж, за чым справа стала... Давай руку!.. Цягні вось тых!.. Ну, жвавей, далучайцеся!

Умомант утварыўся вялікі круг дзяцей, да яго далучыліся і дарослыя, Владзімір Ільіч пайшоў вакол ёлкі і ўсе за ім.

— Ну, запявай! Што-ж ты?—жыва звярнуўся Владзімір Ільіч да той дзяўчынкі, якая расчырванеўшыся, залілася прыемным свежым галаском.

Усе падхапілі песню пра ёлку і закружыліся вакол ёлкі. У гэты час раптам ёлка бліснула рознакаляровымі агнямі—гэта манцёр школы зрабіў такую прыемнасць дзецям. Ён дастаў маленькіх электрычных лямпачак, напярэдадні позна ўвечары, калі ўсе спалі, правёў па-майстэрску шнур, уплёў у галінкі лямпачкі і вось цяпер пусціў ток і адразу ўсіх асвятліў. Лікаванню і радасці дзяцей не было канца, і ўсе яшчэ весялей заспявалі і закружыліся ў дружным карагодзе вакол ёлкі.

Владзімір Ільіч увесь захапіўся дзіцячым святам, весяліўся, смяяўся і дружна спяваў разам з дзецьмі. Яго закідвалі пытаннямі, і ён кожнаму паспяваў адказаць, жартаваў, гаварыў астроты, сам задаваў пытанні, загадкі, і толькі прышлося здзіўляцца, адкуль гэта ён усё ведае, усё памятае. Дружны смех і жарты пераліваліся па залу.

Вось зноў і зноў закружыліся вакол ёлкі, складна і дружна заспявалі другую песню. Ударыў акампанемент раяля, падбадзёрыўшы спевы, і ўсе паімчаліся хутчэй і хутчэй у радасным карагодзе вясёлых і шчаслівых дзяцей. Дарослыя, захопленыя прыкладам Владзіміра Ільіча, таксама набраліся агульнай весялосці, радасці, патокаў смеху, рухаў і клікаў, і весела, і задорна, і памаладому ўсе неслі ўсё, што маглі, у агульнае мора зімовага школьнага свята.

— Ну вось, а калі-ж у кошкі і мышкі? Што-ж гэта вы! Забыліся!—падзадорваў Владзімір Ільіч.

Зноў утварыўся круг, зноў ён там сярод дзяцей...

Глядзіце, з якім захапленнем гуляе ён, не прапускаючы ката, абараняючы мыш! Пільна глядзіць ён—яго не ашукаеш.

Абарона яго надзейная. Ён з запалам аддаецца гульні і гэты запал перадае дзецям, якія гуляюць, захапляючыся гульнёй да самазабыцця.

І раптам так здарылася, што Владзімір Ільіч, які ў першы раз пазнаёміўся з гэтымі дзецьмі, зрабіўся іх лепшым другам і таварышам. Дзеці гаварылі з ім проста, на ты, жартавалі, перапынялі яго, і адчувалася, што ён зрабіўся для іх сваім чалавекам. Яны адбілі яго ад дарослых. Пацягнулі яго з сабой піць чай, частавацца, накладвалі яму варэння, і ўсе як ёсць хацелі штонебудзь для яго зрабіць, а ён ім расколваў арэхі, наліваў чай з гарачых шклянак і зорка сачыў за ўсімі, нібы ўсе яны былі яго сям'ёю. Ён-жа так моцна і шчыра любіў дзяцей! І дзеці гэта адчувалі і любілі яго так-жа сама, і ўсе хацелі быць з ім. Владзімір Ільіч хутка ўведаў імёны дзяцей, і трэба было здзіўляцца, што ён не блытаў іх, а ўсіх запомніў.

З дзецьмі нічога нельга было зрабіць, яны заваявалі Владзіміра Ільіча цалкам. Пацягнулі яго ў другія пакоі, паказвалі ў сваім школьным музеі па прыродазнаўству птушак, мышэй, вавёрку і ўсё, што ў іх толькі было. Паказвалі малюнкі, свой журнал, які яны амаль нікому не давалі чытаць. Владзімір Ільіч паглыбіўся ў іх справы, ды так, нібы ён усё жыццё толькі тое і рабіў, што займаўся са школьнікамі.

І мне хацелася-б, каб усе дзеці ведалі, што сэрца Владзіміра Ільіча заўсёды білася за радасць і шчасце дзяцей. Ён іх цаніў і любіў.

У беленькім доміку жыў шэранькі зайчык. Рабяты 90-га дзіцячага сада Мінска, рыхтуюць да новага года пастаноўку.
Фота. І. Рабіновіча.

У скверы на ёлачным базары (г. Мінск). На здымку: Дзеці аглядаюць ёлку і дзедамароза.
Фота І. Рабіновіча.

С. Михалков

МОЯ ЕЛКА

Ёлку вырублю в лесу,
Ёлку в школу прынесу!

Всю в сосульках ледяных,
В крепких шишках смоляных,
Со смолою на стволе,
Со снежинкой на смоле.

Если встречу я в лесу
Настоящую лису,
Я на елку покажу
И в лесу лисе скажу:

«Ты меня, лиса, не трогай,
Ты иди своей дорогой,
Не задерживай, прошу,
Новый год встречать спешу!»

Мне навстречу выйдут волки,
Скажут: «Стой-ка, паренек,
На опушке вместо елки,
Почему торчит пенек?»

Дятел клювом застучит:
«Почему пенек торчит?»

На деревьях снег ложится,
Все в сугробах, все в снегу,
И от зверя, и от птицы
Я на лыжах убегу!

Я принес из лесу елку—
Наглядеться не могу!

Сто четырнадцать огней
Я один зажег на ней,
От подставки до макушки
На ветвях висят флажки.
Разноцветные хлопушки,
Золотые петушки.

Приходите к нам, друзья,
Эту елку выбрал я!

ЗМАГАЕМСЯ ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ

Звеннявой я працую трэці год. У гэтым годзе наша звяно было комплексным. Мы атрымалі плóшчу зямлі, разбілі яе на ўчасткі. Пасля адпаведнай апрацоўкі правялі пасеў. Ячменю пасеялі 7 гектараў, аўса і бульбы—па 5 гектараў і азімых 9 гектараў.

Ячмень пасеялі на бульбянішчы радковай сеялкай. У глебу ўнеслі некалькі цэнтнераў мінеральнага ўгнаення. Як толькі з'явіліся першыя ўсходы пачалі беражна іх даглядаць. Зрабілі першую праполку, потым другую, а ў некаторых месцах, дзе ячмень быў вельмі засмечан, палолі тры разы.

Любоўны догляд за пасевам даў бліскучыя рэзультаты. Ячменю атрымалі па 32,3 цэнтнера з гектара, бульбы па 230 цэнтнераў. Працавалі ўсе пастаханаўску. У выніку шырокага прымянення соцыялістычных метадаў, правільнай арганізацыі працы і высокай дысцыпліны ў звяне мы змаглі дабіцца высокага ўраджаю ўсіх культур у гэтым годзе. Добра працавалі ў нашым звяне калгасніцы Аляксандра Літвінава, Каця Бычкова, Фрося Шышкова. Яны перавыконвалі нормы на жніве, копцы бульбы і на іншых работах.

Наша звяно ў калгасе лічыцца перадавым. У часе ўборачнай была наладжана таварыская дапамога адстаючым звенням. Наша звяно дапамагло абіваць лён адстаючаму звяну Веры Валчок. Такі метад мы практыкуем часта—у час праполкі, на ўборцы ўраджаю.

У гэтым годзе ў нашым калгасе на працадзень калгаснікі атрымаюць па 4 з паловай кілограмы зернавых, больш 16 кілограмаў бульбы і многа грошай. Мая сям'я выпрацавала 480 працадзён.

Ужо два годы наш калгас з'яўляецца ўдзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі і зацверджан кандыдатам у экспаненты на 1941 год. У мінулым годзе за ўдзел у выстаўцы калгас атрымаў ад Галоўвыстаўкома дыплом другой ступені, матацыкл і 5 тысяч рублёў грашыма. Спадзяюся, што і я таксама атрымаю ганаровае права быць удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў 1941 годзе.

Надежда Купрыянец,
звеннявая калгаса.

Талачынскі раён,
калгас „Перамога".

57 калгаснікаў займаюцца агратэхвучобай у сельгасарцелі „Чырвоны партызан", Мінскага раёна.

На здымку: Заняткі аднаго з агратэхгурткоў пад кіраўніцтвам агранома калгаса Н. П. Бартащэвіча.

Фото К. Якубовіча і Вальфсона (Фотахроніка БЕЛТА).

Ферма нашага калгаса

Я працую з 1930 года на малочна-таварнай ферме калгаса «Заветы Ільіча», Быхаўскага раёна. Таму мне лепш як камунебудзь вядомы яе рост і развіццё. З кожным годам лік пагалоўя ўзрастаў, ферма ўкамплектоўвалася больш высокаякаснымі пародамі жывёлы.

Аднак трэба сказаць, што асабліва добрых поспехаў мы дабіліся за апошнія два-тры годы. Пагалоўе буйнай рагатай жывёлы, свіней і авечак у некалькі разоў павялічылася. Усе работнікі фермы лічаць для сябе вялікім гонарам чэсна выконваць указанні любімага таварыша Сталіна аб усямерным уздыме жывёлагадоўлі ў калгасах.

Рыхтуючыся да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1939 года даяркі ўзялі на сябе абавязацельства—поўнасцю захаваць прыплод ад кароў. Даяркі любоўна даглядалі цялят. У рэзультаце ўсе гэтыя годы мы не маем выпадкаў адыходу маладняка. Поўнасцю захован маладняк і папярэдніх гадоў. Гэта дало магчымасць павялічваць лік пагалоўя ферм.

Мы таксама добра зразумелі, што мала яшчэ мець поўнае ўкамплектаванне ферм. Неабходна было падрыхтаваць жывёле сытую і цёплую зімоўку. Як-жа мы падрыхтаваліся да зімы? Кармамі ферма забяспечана поўнасцю. Засіласаваны зялёныя кармы. Хлявы ацеплены, агледжаны.

Асабліва добра падрыхтавана да зімы памяшканне для маладняка. Тут вялікая заслуга цялятніцы Арыны Новікавай, якая працуе на ферме ўжо тры годы. За гэты час вырасціла 127 цялят. За добрую работу, за высокія паказчыкі па вырошчванню маладняка тав. Новікава была ўдзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 года.

Добрых паказчыкаў у сваёй рабоце дабілася і Дар'я Альховік і іншыя. Яны змагаюцца за ганаровую справу, каб выконваць сталінскае ўказанне і рухаць уперад соцыялістычную жывёлагадоўлю.

С. С. Еўменава,
загадчык фермы, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

На лесазагатоўках

Брыгада лесарубаў у часе абедзенага перапынка сабралася каля кастра. З вялікай увагай слухалі адозву стаўбцоўскіх лесарубаў. Як толькі закончылі чытаць, слова ўзяла Марыя Белакурская.

— Давайце напішам стаўбцоўскім лесарубам, што іх мы не падвядзем... План чацвертага квартала датэрмінова выканаем... Ну, дык як?

Тут-жа брыгады заключылі дагаворы на соцыялістычнае спаборніцтва. А ўвечары Бацэвіцкі сельсовет з удзелам актыва абгаварваў пытанне лесавывазкі. Выступіў брыгадзір другой брыгады калгаса імені Леніна Андрэй Касцян. Ён звярнуў увагу нарады на тое, што асобныя кіраўнікі калгасаў падчас недаацэньваюць жаночую сілу на лесавывазках, і дадаў:

— Заўтра разам са мной едуць жанчыны.

На другі дзень досвіткам першымі выехалі ў лес жанчыны другой брыгады калгаса імені Леніна — Соня Ананіч, Надзя Свірыд, Каця Філончык.

Марыя Белакурская працавала ў гэты час на загатоўцы лесу з усёй жаночай брыгадай. Стаханаўская работа гэтай брыгады натхніла жанчын-возчыкаў і лесарубаў на ўдарную работу. Увечары прыёмшчыкі ўчастка падлічылі загатоўку і вывазку за дзень. Марыя Белакурская з сваім напарнікам Сяргеям Вараксам выканала дзённае заданне на 302 процанты. Возчыцы Соня Ананіч, Надзя Свірыд, Каця Філончык вывезлі па 3,5 кубаметра драўніны пры норме 1,5 кубаметра. Уся брыгада вывезла за дзень 30 кубаметраў і заняла першае месца па сельсовету.

Праз некаторы час у кватэру Мані Белакурскай сабраліся аднасяльчане, дзяўчаты. Яны прышлі павіншаваць з перамогай і з прэміраваннем яе пуцёўкай у дом адпачынку. У гутарцы раптам Алена Альховік запытала:

— Маня, колькі ты зарабляеш на лесазагатоўках?

Маня паказала копіі квітоў, па якіх было відаць, што яна выконвае месячны план на 200—250 процантаў і зарабляе больш 700 рублёў у месяц.

А. Манькоў.

Клічаўскі леспрамгас.

Перадавая брыгада

Трактарыст, камбайнер, машыніст ільноцерабільнай машыны— сталі пачотнай прафесіяй на сяле. Лепшая калгасная моладзь, сярод якой нямала дзяўчат, ідзе на работу ў МТС, вучыцца ў школах механізатарскіх кадраў сельскай гаспадаркі, і ва ўсіх іх адно жаданне,—авалодаць складанымі сельскагаспадарчымі машынамі.

У 1937 годзе дзяўчаты з калгаса «Чырвоная Беларусь» Маша Чайкоўская, Ліза Валуцкая, Шура Чайкоўская паступілі ў Жлобінскую МТС на курсы трактарыстаў. Іх характарыстыка была кароткай: у калгасе працавалі выдатна.

Вось ужо чатыры годы, як яны водзяць па шырокаму калгаснаму полю сталёвыя машыны—трактары. Машу Чайкоўскую яшчэ ў мінулым годзе Наркамзем БССР прэміраваў за перавыкананне плана.

Ранняй вясной гэтага года ў МТС ішло пераўкамплектаванне трактарных брыгад. Дзяўчаты-трактарысткі асталіся працаваць у адной брыгадзе. Да іх накіравалі Анну Навіцкую, якая ўпершыню працавала на трактары.

Надышла гарачая пара. Вясенняя пасеўная кампанія была ў разгары. Трэцяя брыгада атрымала зону для абслугоўвання— тры калгасы: «Чырвоны барэц», імені Чкалава і імені Фрунзе. Гэтыя калгасы лічыліся не з перадавых у раёне. Трактарысткі разумелі, што многае залежыць ад іх, каб калгасы вышлі ў перадавыя. З першых дзён работы ў полі пачалі працаваць па-стаханаўску. Кожная мінута работы ў іх была разлічана. Строга эканомілі гаручае. І перавыкананне плана было звычайнай з'явай для трактарыстак.

Закончылася сяўба яравых. Брыгада падвяла вынікі работы. Рэзультаты аказаліся бліскучымі. План радковай сяўбы быў выканан на 332 процанты. Брыгада вышла на першае месца па МТС. Ёй быў уручан пераходны чырвоны сцяг.

Чарговыя палявыя работы— уборка, пасеў азімых, зяблівае ворыва праходзілі выдатна ў брыгадзе дзяўчат-трактарыстак. Прастоі і аварыі ў іх рабоце лічыліся ганьбай для ўсіх. Камісія па ацэнцы якасці ўспашку прымала заўсёды без заўваг.

Жаночая трактарная брыгада раней другіх справілася з асноўнымі сельскагаспадарчымі работамі. Трактарысткі Маша Чайкоўская і Валуцкая ўзаралі на трактары «ХТЗ» у пераводзе на мяккае ворыва 531 гектар пры норме 360. Шура Чайкоўская— 430. Уся брыгада гадавы план выканала на 130 процантаў.

Такія рэзультаты работы стаханаўскай жаночай трактарнай брыгады.

Жлобін. **Ніна Елісеева.**

Студэнты 2-га курса Гомельскага лесатэхнічнага інстытута (справа—налева) Н. С. Гаўрыльчык, Н. Г. Ткачова, М. К. Падольская, С. М. Сватуха за вывучэннем ручнога кулямёта. Фота А. Шаевіча (Фотахроніка БЕЛТА).

Высокая актыўнасць комсамольцаў

Асобныя комсамольцы і цэлыя арганізацыі нашага раёна праяўляюць выдатную ініцыятыву, накіраваную на палепшанне работы вытворчасці, на выкананне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета аб працоўнай дысцыпліне, аб барацьбе з бракаробствам.

За апошні час асабліва вырас актыў дзяўчат - комсамолак. Узяць, напрыклад, арганізацыю арцелі «Красный корзиночник». У ёй 18 комсамолак. Усе яны стаханаўкі, план выконваюць на 150—180 процантаў. Быў час, калі арцель не выконвала план. На сходзе дзяўчаты рашылі ў выходны дзень, усім калектыўна, выехаць на загатоўку сыравіны. Зараз арцель выходзіць з прарыву, а ў брыгадзе і не было перабояў у рабоце.

Добрым прыкладам можа служыць сакратар пярвічнай комсамольскай арганізацыі калгаса «Маяк комуны», Глухскага сельсовета, маладая настаўніца тав. Мельнікава. Яна ўпершыню абрана на кіруючую комсамольскую работу. І трэба адзначыць, што работа гэтай арганізацыі ажывілася, у ёй па баявому выконваюць рашэнні XI Пленума ЦК ВЛКСМ. Комсамольцы прыкладна працуюць у калгасе. У гэтым годзе ўсе сельскагаспадарчыя работы закончаны своечасова. Калгас разлічыўся з дзяржавай па ўсіх відах паставак. Комсамольская арганізацыя ўзяла на сябе абавязацельства падрыхтаваць жывёлагадоўчую ферму калгаса да зімы. І выканала гэта з чэсцю. У пачатку кастрычніка памяшканні былі ўжо ацеплены. Ферма поўнасцю забяспечана кармамі. Цяпер, калі сельскагаспадарчыя работы ў асноўным у калгасе закончаны, арганізацыя паслала пяць сваіх таварышоў на адыходніцтва.

Сакратаром комсамольскай арганізацыі сярэдняй школы № 2 горада Быхава абрана комсамолка-выдатніца 9 класа тав. Ландо. Гэта арганізацыя змагаецца за выдатную паспяховасць вучняў, за ўзорную дысцыпліну. Комсамольцы звязаны з настаўніцкім калектывам і адміністрацыяй школы. Яны дапамагаюць адзін аднаму ў рабоце. У рэзультаце школа № 2 за першую чвэрць навучальнага года вышла на першае месца ў раёне па паспяховасці.

Неабходна таксама адзначыць і прыкладную работу асобных комсамольцаў. Вось звеннявая па кок-сагызу калгаса «Ільіч», Кузькаўскага сельсовета, комсамолка Марыя Калошкіна. Усе годы яна мела нядрэнныя поспехі ў рабоце, але сёлета поспехі яе выключна велізарныя. За высокія паказчыкі па ўраджаю кок-сагыза яна зацверджана кандыдатам на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку 1941 года.

Калгасніца Ольга Паздынякова—звеннявая па ільну калгаса «Першае мая», Гарадзецкага сельсовета, дэпутат раённага Совета дэпутатаў працоўных з'яўляецца стаханаўкай у калгасе. З кожным годам дабіваецца павышэння ўраджайнасці ільна. Пры ачыстцы вадаёма яна была ініцыятарам стаханаўскага руху.

З кожным днём расце актыўнасць комсамольцаў. Растуць перадавікі стаханаўскай працы, як на прадпрыемствах, так і ў калгасах.

Л. А. Севасцьянава,
сакратар РК ЛКСМБ.

г. Быхаў.

Незабыўныя ўражанні

У ліку дэлегацыі ад Беларускай ССР я ездзіла ў Казахскую Совецкую Соцыялістычную рэспубліку на святкаванне яе 20-годдзя. Не хапае нават слоў, каб выказаць тую вялікую радасць і цеплыню, якой былі акружаны мы з боку шчаслівага казахскага народа.

За годы совецкай улады пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі Казахская ССР вырасла ў перадавую рэспубліку Совецкага Саюза. Колькі радаснага і цудоўнага бачылі мы ў гэтай квітнеючай краіне. Які вялікі, прыгожы горад Алма-Ата—сталіца Казахскай ССР. Кожны вечар мы хадзілі ў тэатр, на экскурсію.

Вельмі вырасла культура казахскага народа, нацыянальная па форме і соцыялістычная па зместу. Мы многа гутарылі з працоўнымі. Яны выказвалі сваю любоў да партыі, да радзімы, да таварыша Сталіна за радаснае жыццё. Мы таксама расказвалі ім аб шчаслівым і радасным жыцці беларускага народа.

Асабліва радасна на сэрцы за нашых сясцёр—шчаслівых жанчын брацкай рэспублікі. Многія жанчыны скончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы. Таксама не мала іх працуе і на кіруючай рабоце. Вось напрыклад, Наркомам сувязі працуе жанчына, сакратаром Цэнтральнага Камітэта комсамола таксама працуе жанчына.

Паездка ў Казахскую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку зрабіла на мяне вялікае ўражанне, якое надоўга астанецца ў памяці. Такое цудоўнае, шчаслівае жыццё працоўныя Казахскай ССР разам з усім народам Совецкага Саюза атрымалі дзякуючы мудраму кіраўніцтву партыі Леніна—Сталіна.

Анна Іосіфаўна Акулёнак,
дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

Магілеў.

Стаханаўка-многастаночніца Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі „КІМ" кандыдат партыі Е. Х. Скобава за самастойнай вучобай у партыйным кабінеце фабрыкі.

Фото І. Лосева (Фотахроніка БЕЛТА).

Рэзультаты бесклапотнасці бацькоў

Позна вечарам на Ленінскай вуліцы ў Мінску стаяла група школьнікаў. Адзін з іх штосьці вельмі бойка і захапляюча расказваў акружаючым яго хлопчыкам. Ён рэзка выдзяляўся сярод астатніх. Пінжак у яго быў расшпілены, шапка набекрэнь, у зубах папіроса. У гэты час падышоў міліцыянер і з дакорам звярнуўся да расказчыка:

— Ты што ўначы па вуліцах блукаеш? Хочаш зноў у міліцыю папасці?—Хлопчык палажыў рукі ў кішэні, выпяціў грудзі ўперад і развязным тонам заявіў:

— Падумаеш,—вядзі. Патрымаеце там некалькі гадзін і пусціце...

Ці вось другі выпадак. У магазіне на плошчы Свабоды хлопчык хацеў выцягнуць з кішэні жанчыны грошы. Гэта заўважыў радам стаячы пакупнік. Ён пачаў яго сароміць. Але гэта ніколькі не збянтэжыла хлапца. Наадварот ён з некаторай пагардай глядзеў ва ўпор на «дзядзю» і цвярдзіў:

— Ну і што-ж! Ну і што-ж!..

У гэту гутарку ўмяшаўся работнік магазіна, ён вывеў хлапца вон. Той адышоў трохі далей, пару разоў свіснуў. Да яго вышаў другі і пайшлі кудысьці як ні ў чым ні бывала. Такія выпадкі ў нас адзіныя, але яны ёсць.

Мы гэтыя два прыклады прыводзім таму, каб паказаць да чаго даводзіць безнадзорнасць дзяцей. Мы ўпэўнены, што калі-б бацькі гэтых хлопчыкаў цікавіліся-б, дзе дзіця ходзіць не толькі ўначы, але і днём, у якім асяроддзі яно знаходзіцца, з кім сустракаецца, якія навыкі прыносіць з вуліцы,—такіх дзікіх з'яў у нас безумоўна не было-б нават і адзінкамі.

Наша сапраўднасць—гэта дзеці, якія не ведаюць нястачы, яны акружаны ўсеагульнай ласкай і ўвагай народа, урада, партыі. Мы прызвычаены бачыць дзяцей на вуліцы апранутых, абутых, жыццерадасных.

І раптам на белым фоне з'яўляецца чорная пляма,—выпадак у вялікай дзіцячай сям'і,—безнадзорны, недысцыплінаваны, з пошлымі навыкамі.

Вось дырэктар чацвертай школы горада Мінска прывёў у міліцыю вучаніц Зіну і Галіну. Яны забралі з вешалкі чужое паліто. Там было ўстаноўлена, што яны дружаць з вучаніцай 6 школы Анастасіяй, якая ўжо не раз злоўлена, як малалетні злачынца.

Што зрадніла гэтых дзяўчат? Вуліца. Больш нічога. А рэзультат гэтай дружбы відавочны. Анастасія падвучыла Зіну і Галіну ўкрасці ў сваёй школе паліто. Яны выканалі волю сваёй падругі і такім чынам сталі на ганебны шлях.

А дзе іх бацькі? Што яны глядзяць? Аказваецца справа вельмі простая. Яны з'яўляюцца пасіўнымі наглядальнікамі, а ў некаторых выпадках разводзяць бездапаможна рукамі. Так безадказна адносіцца да выхавання бацька Галіны, аб якой мы тут расказвалі. Сам ён механік аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў горада Мінска. Член партыі. Але як ён рэагіруе на такі ўчынак дачкі? Так як пабочная асоба. Ён згодзен, што дачка яго дрэнна выхавана. Гатоў звярнуцца за дапамогай у міліцыю. Усю віну за дрэнныя паводзіны дачкі звальвае на маці, кажучы, што яна абараняе дачку.

Мы не збіраемся абараняць маці, якая замест таго, каб усямерна асуджаць непрыстойныя ўчынкі дачкі, абараняе яе; гэтым самым такая маці накіроўвае дачку на злачынны шлях. Аднак і бацька вінават у такой-жа меры, як і маці, ён своечасова не цікавіўся выхаваннем свайго дзіцяці.

А ці-ж такая маці, як маці хлопчыкаў Генадзія і Еўгенія, бацька якіх працуе бракёрам у адной з арцеляў, не заслугоўвае ўсеагульнага ганьбавання, калі яўна пакрывае і нават садзейнічае сваім сынам рабіць цёмныя справы? Аднойчы яе малодшы сын Еўгеній расказваў у міліцыі, што старшы брат Генадзій украў грошы і перадаў іх мацеры, за якія тая купіла яму паліто. У гэтай-жа сям'і старшы сын асуджан за кражу. А Генадзій імкнецца ўцягнуць у злачынныя дзеянні свайго васьмігадовага браціка Еўгенія. Такія паводзіны бацькоў павінны разглядацца не толькі ў крымінальным парадку, а павінны стаць здабыткам тых калектываў, дзе яны працуюць.

Для юнакоў і дзяўчат нашай краіны прадастаўлены цудоўныя палацы піонераў і акцябрат, раскошныя сталінскія школы, тэхнічныя дзіцячыя станцыі, пляцоўкі для гульняў, каткі, фізкультурныя пляцоўкі. Нашы дзеці выкарыстоўваюць усё гэта так як падабае маленькім грамадзянам краіны соцыялізма.

Але-ж мала грамадскасць займаецца іменна вось гэтымі адзінкамі—безнадзорнымі дзецьмі, якія блукаюць па вуліцах без справы, падпадаюць пад уплыў вуліцы. Патрэбна, каб комсамол, бацькоўскія камітэты займаліся імі больш.

У дзіцячых пакоях пры міліцыі ўстаноўлена дзяжурства настаўнікаў з тым, каб апошнія праводзілі выхаваўчую работу з дзецьмі, якія пападаюць туды. На самай справе настаўнікі казённа адносяцца да гэтай адказнай справы. Прыдуць, пасядзяць, зробяць адзнаку ў журнале аб сваёй прысутнасці, часамі нават не пагутараць з дзецьмі. Такое шаблоннае выкананне задачы па выхаванню дзяцей з'яўляецца проста злачынным.

Чуждыя ўплывы на дзяцей—гэта ганьба для сям'і. Бацькі павінны стварыць такія ўмовы для дзіцяці, якія-б не далі ні малейшага повaду яму ўспрыймаць дрэннае. Паводзіны бацькоў саміх у быту, на рабоце па вінны быць прыкладам для дзяцей. На вялікі жаль ёсць яшчэ такія бацькі, якія сваімі паводзінамі ўплываюць адмоўна на сваё дзіця.

Маецца пастанова Мінскага гарадскога Совета па барацьбе з дзіцячай безнадзорнасцю. Дзецям пэўнага ўзросту дазваляецца толькі ва ўстаноўленыя часы бываць на вуліцах без бацькоў, а таксама наведваць грамадскія месцы. Між тым часта можна бачыць як дзеці ходзяць па вуліцы позна ўначы адны. Тут міліцыя, органы народнай асветы, райсоветы дапускаюць ліберальныя адносіны к тым бацькам, якія думаюць, што пастанова органаў улады іх не датычыцца.

Барацьба з дзіцячай безнадзорнасцю павінна стаць неад'емнай справай усёй грамадскасці, бо на фоне культурнага і заможнага жыцця працоўных гэта з'яўляецца ганебнай плямай.

К. Ф.

Ванда Васілеўская

Польда

Яе звалі Апалонія, але нават яна сама, здаецца, не помніла аб гэтым. Даўгое, цяжкое імя. Польда было карацей і неяк больш падыходзіла. Так яна і стала Польдай. І тады, у той перыяд, які яна не любіла ўспамінаць, і потым.

Не тое, каб яна саромілася тых дзён. Чаго ўласна? Нічога не зробіш, калі чалавек не хоча падохнуць з голаду, можа здарыцца і так. Хай саромяцца тыя, прыгожа апранутыя паны, з роўнай, запрасаванай складкай штаноў, старанна выбрытыя, быццам на свеце вечнае свята.

Цяпер, калі з мінулым было пакончана, Польда, праходзячы міма такога франта, любіла высока падняць галаву і змерыць яго пагардлівым, насмешлівым поглядам. Ахвотней усяго яна-б плюнула яму прама ў выпешчаную морду.

А паны азіраліся на Польду. На яе амаль класічна правільны твар, на масу светлых валасоў, на каралеўскую асанку. Але яна плявала на іх. Яна насмешліва глядзела, як яны паважна ідуць па тратуару, як старанна абыходзяць лужы, каб не забрудзіць бліскучых бацінак.

Яе брала ахвота штурхнуць такога піжона ў самую глыбокую лужу, каб вадкая гразь хлюпнула на сіні касцюм, на лайкавыя пальчаткі, на ружовы твар: «Эх, ты, фарсун!..» Яна ведала сваё аб гэтых маладых людзях, так прыгожа апранаўшыхся, ведала сваё аб гэтых пажылых, шаноўных бацьках сямействаў, якія так сур'ёзна праходзілі па вуліцы, быццам бы ні на што не звяртаючы ўвагі, а залаты ланцужок часоў качаўся на круглым жываце. Яна-то ведала, як абстаіць справа, і смяялася ў душы над наседкамі-жонкамі, якія спадарожнічалі тоўстым панам, такія-ж тоўстыя і задаволеныя сабой, шамацеўшыя шоўкам, ні аб чым не ведаючыя.

Па вуліцы ты ідзеш шаноўны, сур'ёзны, нават бруха нясеш, як святыя дары, але якім ты быў, калі прыходзіў да мяне і плаціў гэтыя няшчасныя злотыя, дрыжучы над імі—як-бы не пераплаціць?

Мабыць, гэта пагарда, гэта агіднасць і дазволілі Польдзе тады, у самы цяжкі час, кінуць «такое» жыццё і пачаць спачатку.

Якраз на суседняй вуліцы ёй знайшлася работа. Там капалі катлаван пад фундамент, калі яна першы раз астанавілася ля яшчэ неабгароджанага месца. Яна адчувала сябе нейкай стомленай, можа быць, ад асабліва на гэты раз цяжкай ночы. Яна абаперлася аб слупік і бяздумна глядзела, як з лапаты ляціць увышыню бурая гліна. Малады хлапец, які трымаў гэту лапату, узняў галаву і зірнуў на яе.

— Няма чаго вочы вылупляць,—сказаў ён са злосцю.—Бачыш, як стала! А гэтак за лапату ўзяцца ці не заўгодна?

На адну мінуту Польда задумалася: пазнаў ён ці не пазнаў. І ў гэту адзіную ў жыцці мінуту ёй страшэнна захацелася, каб—не, каб не пазнаў. Яна ўсміхнулася хлапцу і адразу адчула: не пазнаў.

Агідныя дні і ночы яшчэ не паклалі пячаткі на яе твары, яшчэ не сцерлі бляску вачэй і залатога адліва валасоў, яшчэ не адзначылі высокага, яснага ілба. Яшчэ быў час выратавацца. Польда зноў усміхнулася, уся светлая ад сонца, якое стаяла прама над будоўляй.

— Чаму-ж? Я-б пайшла... у памочніцы.

Хлапец спыніў работу, абаперся на лапату. З мінуту ён разглядаў дзяўчыну. Потым сплюнуў скрозь зубы:

— Ну, што-ж, тады да майстра... можна...

Астатнія рабочыя паднялі галавы. Яна стаяла вышэй іх на ўскраі выкапанай ямы, высокая, прамая, у кароне залатых валасоў на прыгожай галаве.

— Вось дзяўчына! — уздыхнуў хтосьці, і Польда весела усміхнулася.—Глядзі-ж, глядзі—спадабалася!

— Майстар там!—паказалі ёй, і Польда асцярожна, каб не паслізнуцца, зышла па схілу, ступіла на вагаючуюся дошку і лёгка перайшла па гэтаму мосціку, паміж горамі карычневай, пахнучай вільгаццю гліны.

* * *

Так гэта і пачалося. А пачаўшыся, пайшло гладка. Закасаць па локаць рукавы, моцна падвязаць спадніцу—і за насілкі. Другі мужык запыхаецца, а Польдзе хоць-бы што!

— Яшчэ далажы!—весела пакрыквае яна на падростка, які спыняецца з белай пенай вапны на лапаце. Вядома, можна далажыць. Гэта-ж не хто-небудзь, а Польда. Яна больш падніме, далей нясе, хутчэй вернецца. Пад заляпанай вапнай блюзкай напружваюцца мускулы плеч, як на мрамарнай статуі. Вапна на залацістых валасах і радасць на твары.

Эй, паварачвайцеся жывей, такія-гэткія, каб вас баба не абагнала! Праўда, не звычайная баба, як усе бабы, а Польда! Нават майстар яе пабайваецца. Праўду кажучы, тут, на будоўлі, ён ні аднаму муляру не пасмее слова сказаць: народ гарачы, з ім размовы кароткія. Дадуць цэглай па галаве ці перпендыкулярам па нагах, потым шукай-свішчы. Але памочнікі—іншая справа. Толькі адна Польда ўмее так паставіць сябе, што і майстар ёй слова не скажа, і муляры не адважацца на яе пакрыкваць. Ды і няма за што: баба працуе, як мужчына.

Спачатку некаторым не вельмі спадабалася, што яна такая прыгожая. Вядома, дзе вельмі прыгожая баба, там заўсёды выйдзе якая-небудзь блытаніна. Але тут—не. Цягне вапну, нават за цэглу бярэцца; у суботу, калі справа дойдзе да бутэлькі, ліха схопіць, але што датычыцца гэтага самага—ні-ні.

Прабавалі рэбяты яе зачапіць, ну,—рука ў яе цяжкая. І сказаць умее гэтак па-простаму:

— Эх, ты... не дуры ты сабе

галаву, з мяне хопіць мужыкоў, надоўга хопіць!

Ну, хопіць, так хопіць. Хай будзе так. Дзіўная ўсё-ж дзяўчына, але хай яе.

Скрыпяць пад нагамі лясы, белая вапна ў насілках кіпіць, як густая смятана. Цэгліны кладуцца роўнымі радамі, трэба хутка бегчы па лясах з цяжкімі насілкамі, таму што там, наверсе, быццам звар'яцелі, працуюць, як шалёныя. Ну, паглядзім—хто каго! Покуль яшчэ нікому не ўдавалася загнаць Польду.

А потым забастоўка. Ну, вядома, вечная будаўнічая гісторыя. Кожны сезон, як толькі пачынаецца будаўніцтва,—тая-ж песня. Зніжаюць плату на адной, на другой рабоце. Дарагавізна, моў, нястачы, крызіс, цяжка. Ясна, крызіс заўсёды на домаўласніка: толькі муляр, як сыр у масле катаецца. Кожны дагаварваецца, як можа. Таргуецца ва ўсю.

Дурны народзішка і згаджаецца, хоць потым кляне сябе. А потым заработак падае ўсё ніжэй і ніжэй. Нарэшце, цярпенне лопаецца—і тады забастоўка.

Зал перапоўнен людзьмі, на двары поўна, не могуць змясціцца. У горадзе поўна будаўнічых рабочых. І да стачак яны больш схільны, чым тыя, што цэлымі днямі гнуць спіну над станком. Ці таму гэта, што яны ўсю зіму не працуюць, ці таму, што ў сезон заўсёды не тут, дык там можна знайсці работу, ці, нарэшце, таму, што прызвычаіліся да ветра, авяваючага галовы, і да песні, якая перакідаецца з будоўлі на будоўлю?

Гэта невядома, праўда толькі тое, што варта крыкнуць: «Забастоўка!», як усе рукі ўзнімаюцца ўверх. Усе муляры ўперад, за імі адразу плотнікі, цагельшчыкі, памочнікі. Хопіць—хай падпішуць калектыўны дагавор, якая стаўка, дзе, калі! І кропка.

І на другі дзень чырвоныя цагельныя сцены, яшчэ не вырасшыя, як след, у вышыню, стаяць пустыя. Бурая гліна ляжыць узгоркамі, і вапна тоўстай белай пенкай застывае ў ямах.

А на сходзе—кіпіць. Над бабамі верхаводзіць Польда. Шэрыя вочы, як полымя:

— Эх, бабы, не ўступім, вайна дык вайна!

І ідзе вайна. Дзень, другі. Тыдзень, другі, трэці. Паны-прадпрыемцы заўпарціліся. Што гэта, рабочы будзе дыктаваць ім сваю волю? Ні за што! Няхай работа стаіць, няхай сонца паліць цэглу, няхай дождж размывае вапну і гліну—вайна, дык вайна! Паны-прадпрыемцы ўсміхаюцца. Ну-ка, хто далей вытрымае? Вытрымліваць лёгка на поўны страўнік, у добрай кватэры і з бумажнікам, успухшым ад грошай. Цяжэй тым, якія ледзь некалькі разоў атрымалі тыднёвую плату пасля беспрацоўнай зімы і прама стогнуць з голаду.

Трэці і чацверты тыдзень. Твары людзей цямнеюць, гнеў сціскае вусны ў вузкую лінію. На вытрымку. Ці мы, ці яны.

Па дамах плачуць галодныя дзеці. Ніхто ўжо не хоча даваць напавер у крамах. Скончылася нават бульбяная лупіна, скончыліся хлебныя скарынкі, у твар адкрыта і бессаромна глядзіць голад.

Польда бегае па хатах. Польда выкрыквае на мітынгу:

— Чым яму ўсё жыццё падыхаць, хай цяпер памрэ, адразу лепш! На што ты яго будзеш гадаваць? Хлапчука зладзеем, дзяўчынку курвай? Сціснем зубы і паглядзім, хто далей вытрымае!

На велізарным участку гудзіць тысячны натоўп. Калі так, дык так. Паны-прадпрыемцы не баяцца, хочуць узяць голадам, трэба трохі напалохаць пана старосту. Хай ведае, што ў горадзе забастоўка. Трэба паказацца ў горадзе: хай людзі ведаюць, што забастоўка!

І праз жалезную калітку натоўп выліваецца на вуліцу.

— Жанчыны, уперад!—камандуе Польда. І сама становіцца ў першым радзе. Згуртаванымі радамі яны ідуць за ёй. Памочніцы, маладыя дзяўчаты і мацеры. Пахудзеўшыя, зведзеныя голадам твары, ліхарадачныя вочы. Эх, шырокая вуліца, жорсткі брук! Мацней біце ў брук, ногі ў парваных ботах! Залатая галава Польды, як сцяг, уперадзе. Ва ўсю шырыню вуліцы, як бурай, нясе хвалю многатысячных натоўпаў.

З грудзей, без закліку, без чыйго-небудзь знаку, вырываецца песня. Ад усяго сэрца, ва ўсё горла, ахрыпнуўшым голасам Польда спявае, ва ўласным сэрцы знаходзіць патрэбныя словы:

Вставай, проклятьем заклейменный,
Весь мир голодных и рабов!

Камісарская шабля ў руках Польды.

Вуліцы бялеюць у сонечным святле. У вокнах—твары. Прахожыя спыняюцца. Шчыльнай лавай, морам галасоў плыве хваля дэманстрацыі.

Збоку, на папярэчнай вуліцы, свісток. Адзін, другі. Ого! Дзесьці ўдалечыні мільгануў сіні мундзір. Загусцела, засінела ў завулку. Па натоўпу — дрож, радасная, смелая дрож. Вось ужо выхад на шырокую плошчу з зялёнымі дрэвамі сквера. І там, прама перад натоўпам,— нарад паліцыі.

Вышэй, гучней, адважней узнімаецца песня:

Это будет последний...

Польда трывожна аглядае жанчын. Не спалохалася-б якая. Але не, яны ідуць роўна, як ні ў чым не бывала. І тады—паліцэйскі свісток, праразлівы, аглушальны. Высока ў паветры падняты гумовыя палкі, серабрысты бляск камісарскай шаблі. Зверху, з бакоў удары палак. Натоўп змінаецца. Рабіць няма чаго, прыходзіцца ўцякаць, каб зноў пастроіцца на наступнай вуліцы і зноў лавай ісці ўперад.

— Гэтага, гэтага, у светлай кашулі!—рэзкім голасам крычыць камісар, і прагна працягваюцца дзесяць пар паліцэйскіх рук.

Ого, яшчэ чаго! Гэтага, у светлай кашулі, светлавалосага юнака, што вядзе забастоўку?!

Вочы Польды зацягваюцца чырвоным туманам. Скачок—кулаком у грудзі камісара, у ззяючы срэбрам сіні мундзір. Рванула. Камісарская шабля ў руках Польды. Аб калена—і камісарская шабля ламаецца папалам. Цяпер далёка кінуць абломкі камісарскай шаблі на брук. А дзе той? Ого, пераскочыў праз агарожу, цяпер ужо яго ніхто не схопіць. Ці-ж грузнаму паліцэйскаму дагнаць дзіця Кракава?

Вочы Польды блішчаць дзікай радасцю.

Паліцэйская палка цяжкая і падае на плечы, на спіну, на шыю, як раптоўнае полымя. Эй, бабы! Хутчэй руку ў кішэнь, ну-ка, перцу мярзотнікам у дурныя, вытарашчаныя вочы! І зноў у кучу, зноў разам, і зноў песня!

«Гэты, у светлай кашулі», ужо зноў уперадзе, і зноў грыміць песня. Пакажам кракавянам, як бастуюць кракаўскія муляры!

Галава Польды гарыць, як залатое полымя, арэолам растрапаных валасоў. І, як блакітнае полымя гараць вочы.

* * *

А потым—зала суда. З усмешкай, ранейшай насмешлівай усмешкай, Польда глядзіць прама ў твар суддзі. Ведаю я цябе, пан суддзя, і апраніся ты ў яшчэ больш урачыстую тогу, усёроўна, я пазнаю цябе пад ёй, абаронца і вартаўнік законаў, скрозь усё ўбачу твой хлуслівы твар!

Расцягнута, невыразна капаюць шэрыя словы. Польда ўсміхаецца. Асцярожна, коса аглядаецца. Так, ён вядома, тут. Пан камісар тут. Што-ж пан камісар будзе паказваць?

У прапыленым паветры залы суда сустракаюцца два погляда. Блакітнае полымя вачэй Польды і круглыя зронкі камісара. У сэрцы гучыць дзёрзкі смех. Ах, у цябе рэвальвер на баку і шабля ў руках, і срэбнае шыццё і галуны на мундзіры, за табой стаіць тысяча сваіх людзей і параграф, і прадпісанне, а ўсё-ж тут перамога за мной, за памочніцай муляра Польдай! Дзе шабля, пан камісар? З дрэннага матэрыяла твая шабля, пан камісар, калі з ёй справіліся рукі памочніцы муляра!

Пан суддзя ціха, абдумана пытаецца. Пан камісар ціха, абдумана адказвае. Як ён заклікаў разыйсціся, а натоўп не паслухаўся, як...

Пан суддзя ціхім голасам пытае камісара, ці пазнае ён абвінавачваемых. Позірк круглых зронкаў слізгае па жменьцы людзей на лаве падсудных. Як-жа, як-жа, пан камісар пазнае.

— І гэту жанчыну?

Позірк камісара слізгае па светламу твару Польды. Блакітныя вочы жанчыны робяцца халоднымі, як лёд. Вочы камісара, як заварожаныя, неахвотна акунаюцца ў іх блакітны струмень.

Польда лічыць у вуме: тры дні за ўдзел у вулічнай бойцы, тры-чатыры-пяць год за абразу паліцыі дзеяннем. Блакітныя вочы глядзяць насмешліва.

Раскажы, раскажы, як была справа! Раскажы, што ты стаяў як дурань, калі цябе трэснула кулаком памочніца муляра, дзяўчына з прадмесця. Што ты дазволіў адабраць у сябе шаблю, знак улады, і зламаць на калене, як пруцік. Раскажы, раскажы!

Камісар цераз сілу адарваў зронкі ад блакітнага струменю яе позірку. Пазіраючы ў акно, у бруднае, пыльнае шкло, ён ціха гаворыць:

— Так. І гэту жанчыну. Яна была ў натоўпе.

Раскажы, раскажы як была справа!

І больш нічога?

Пагардлівая ўсмешка з'яўляецца на вуснах Польды. Яна пагардліва ўсміхаецца, атрымоўваючы свае тры дні.

* * *

Я не ведаю, дзе цяпер Польда. Не ведаю, у якіх новых баях будзе ззяць яе залатая галоўка і чыя шабля зламаецца ў яе моцных руках.

Але я ведаю, што яна існуе. І што я яшчэ сустрэнуся з ёй на адной дарозе, на агульнай дарозе ўсіх, што змагаюцца.

Парады па кулінарыі

Салянка грыбная

(На 5 чалавек)

200 грамаў сушаных грыбоў (неабавязкова белых), ½ кілограма капусты квашанай, 200 грамаў цыбулі рэпчатай, 200 грамаў морквы, ½ кілограма бульбы, палова стакана белых тоўчаных сухароў, 50 грамаў алею, 100 грамаў тамату, 1 сталовая лыжка цукровага пяску.

Перамыць грыбы ў халоднай вадзе, паставіць гатаваць да мяккасці ў двух стаканах вады. Калі зварацца, вынуць грыбы, даць астынуць, нашынкаваць іх, потым нашынкаваць дробна і цыбулю. Масла раздзяліць на дзве часткі, адну палову зліць у каструлю, палажыць цыбулю і грыбы, паставіць тушыць, падліўшы ў іх грыбнога бульёну. Нашынкаваць моркву, перамыць, адціснуць, потым нашынкаваць капусту і паставіць усё гэта тушыць у грыбным бульёне, усыпаўшы цукар. Няхай варыцца да мяккасці. Памешваць.

Бульбу пачысціць, нашынкаваць тонкімі кавалачкамі, выкласці на разагрэтую патэльню, насаліць, засмажыць. Калі ўсё будзе гатова (цыбуля з грыбамі, морква, капуста, бульба), змяшаць, палажыць тамат, уліць другую частку масла, перамяшаць. Патэльню пасыпаць сухарамі, вылажыць на яе ўсё; калі капуста, падліць трохі грыбнога бульёна, пасыпаць сухарамі зверху і паставіць у печку духавую ці ў «цуда-печку» на карасінку.

Застаўшыся грыбны бульён можна ўжываць у любы суп.

Рагу з гародніны

½ кілограма морквы, 100 грамаў пятрушкі, 200 грамаў сельдэрэя, 1 кілограм бульбы, 150 грамаў тамату, 50 грамаў алею, 50 грамаў сушаных грыбоў, 1 сталовая лыжка пшанічнай мукі, ½ кілограма гарбуза.

Вычысціць усе карэнні, перамыць (ад сельдэрэя выкінуць ліст, а сцяблы ўжыць у рагу). Перамыць грыбы, зварыць іх у двух стаканах вады. Калі грыбы зварацца, нашынкаваць вялікімі кавалкамі, палажыць зноў у бульён і палажыць туды-ж тамат. Вычысціць і нашынкаваць бульбу, гарбуз і цыбулю, пасмажыць іх у масле на распаленай патэльні. Карэнні нарэзаць кавалкамі і палажыць у бульён да грыбоў. Закрыць і пасаліць. Калі стушыцца, палажыць бульбу з цыбуляй. Калі будзе рэдкавата, усыпаць паступова муку, асцярожна памешваючы.

Грыбная ікра

½ кілограма сухіх грыбоў (любых), ½ кілограма цыбулі, 100 грамаў масла раслінnага, адна сталовая лыжка разведзенага воцату, ½ чайнай лыжкі перцу молатага.

Перамыць грыбы, адварыць, прапусціць праз мясарубку, парубіць дробна цыбулю, пакласці ў каструлю, утушыць у масле, скласці ў каструлю грыбы, падсыпаць перцу, солі па смаку; калі ўсё гэта ўтушыцца, уліць воцат. Калі будзе суха, уліць грыбнога бульёна, каб ікра мела выгляд кашыцы; есці, намазваючы на хлеб.

Рулет бульбяны з грыбамі

Паўтара кілограмы бульбы, 200 грамаў грыбоў, 200 грамаў цыбулі, 50 грамаў алею, 1 яечка, 1 сталовая лыжка пшанічнай мукі.

Бульбу пачысціць, пасаліць, паставіць на агонь, але не даць разварыцца, зліць ваду і сцерці ў пюрэ, палажыць сталовую лыжку масла. Грыбы вымыць, адварыць да мяккасці, прапусціць праз мясарубку, цыбулю нашынкаваць, утушыць з грыбамі. Вылажыць гарачую бульбу на процівень ці патэльню (змазаныя маслам), абмачыць рукі ў вадзе, зрабіць з гарачай бульбы даўгую палоску з луначкай, палажыць у яе грыбы, зашчыпаць, абраўняць абмочанай у вадзе рукой. Зверху змазаць яйцом і паставіць у печку. Можна пячы і ў «цуда-печцы» на карасінцы і ў духавой шафе.

Маркоўны пудзінг

2 кілограмы морквы, 1 стакан сухароў, 3 яечкі, 1 сталовая лыжка цукровага пяску, 50 грамаў слівачнага масла, 1 сталовая лыжка пшанічнай мукі, 2 стаканы малака.

Ачысціць моркву, паварыць трохі ў салёнай вадзе, прапусціць праз мясарубку, усыпаць сухары, уліць расцёртыя жаўткі (жаўткі расціраюцца ў цукры дабяла). Бялкі ўзбіць асобна да пены і пакласці ўсё ў моркву. Змазаць форму маслам, абсыпаць тоўчанымі сухарамі, вылажыць прыгатаваны пудзінг, выраўняць, паставіць у духавую шафу або на карасінку, у «цуда-печку». Пячы трэба не больш 40 мінут.

Соус ужываецца той самы, што і пры бульбяных катлетах. Малако трэба выліваць асцярожна, паступова, каб атрымаць соус смятаннай гушчыні.

Боршч грыбны.

200 грамаў буракоў, па 100 грамаў сельдэрэя, пятрушкі, морквы, цыбулі, 50 грамаў грыбоў, 50 грамаў тамату, 200 грамаў капусты, 50 грамаў смятаны, адна сталовая лыжка разведзенага воцату, шчыпотка перцу, 2 лыжкі раслінnага або слівачнага масла, адна сталовая лыжка пшанічнай мукі, адна чайная лыжка цукровага пяску.

Вычысціць, перамыць, нашынкаваць карэнні і гародніну, а таксама грыбы, адвараныя раней у 10 стаканах вады. Усё разам (акрамя грыбнога бульёна) скласці ў каструлю, палажыць масла, цукар і соль, вымешваючы, усыпаць муку. Уліць поўстакана грыбнога бульёну. Накрыць і тушыць усё памешваючы. Калі гародніна дасць колер, развесці ўсё астаўшымся грыбным бульёнам, пасаліць па смаку. Перад абедам уліць у боршч смятану.

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН

Адрас рэдакцыі: Мінск, Совецкая, 49, 1 паверх. Тэл. 24058

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 3039. Тыраж 13.000 экз. У4376.
Здана ў друк. 17/XII—40 г. Падпісана да друку 30/XII—40 г. У нумары 2½ друк. арк. 120.140 друк. знак.

ЦАНА 20 кап.

Да гэтага нумару бясплатна дадаецца ўкладка-выкрайка



За два годы работы на абутковай фабрыцы імені Кагановіча комсамолка Я. Ф. Ліпніцкая выдатна авалодала шасцю аперацыямі. Цяпер яна працуе ў рэзерве і заўсёды выконвае план да 180 проц. Тав. Ліпніцкая актыўны грамадскі работнік, рэдагуе цэхавую насценгазету. На здымку: Тав. Ліпніцкая за работай на кальцавой машыне.

Фото І. Рабіновіча.